ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

УДК 811.161.3:81’367.332.1

**КАПЦЮГ**
**ІРЫНА УЛАДЗІМІРАЎНА**

# ЗВАРОТАК У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ: СТРУКТУРНА-СЕМАНТЫЧНЫ І ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ АСПЕКТЫ

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Мінск, 2014

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Навуковая работа выканана ва УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

| | |
|---|---|
| **Навуковы кіраўнік:** | **Яўневіч Міхаіл Станіслававіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускага мовазнаўства УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” |
| **Афіцыйныя апаненты:** | **Кудраватых Ірына Пятроўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры культуры маўлення і міжкультурных камунікацый УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” |
| | **Русак Вольга Уладзіміраўна**, кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі УА “Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт” |
| **Апаніруючая арганізацыя:** | УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” |

Абарона адбудзецца “23” снежня 2014 г. у 12.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.03 пры ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, e-mail: inlinasbel@tut.by, тэл. 284-27-20).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы “21” лістапада 2014 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук дацэнт Паляшчук Н.В.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Значную ролю ў арганізацыі камунікатыўнай структуры сказа выконвае зваротак, які ўказвае на адрасата маўлення, выражае асабістыя суб'ектыўныя адносіны да субяседніка, дае яму пэўную характарыстыку, якая выяўляецца з кантэксту выказвання. Адрасант пры ўжыванні розных тыпаў зваротка імкнецца звярнуцца да субяседніка так, каб больш поўна выразіць адносіны да адрасата, задаць эмацыянальнасць выказванню.

Выбар тэмы дысертацыйнага даследавання выкліканы недастатковай распрацаванасцю пытанняў рэпрэзентатыўнасці зваротка, адсутнасцю яго лексіка-семантычнай класіфікацыі і дыферэнцыяцыі ў залежнасці ад жанравай прыналежнасці тэксту.

**Актуальнасць** дысертацыйнага даследавання абумоўлена неабходнасцю, па-першае, шматаспектнага сістэмнага аналізу зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове; па-другое, вырашэння пытання аб сінтаксічным статусе, функцыях, спосабах і сродках выражэння зваротка; па-трэцяе, вызначэння асаблівасцей ужывання ў ролі зваротка намінацый роднасці і сваяцтва, назваў асоб паводле полу і ўзросту, антрапонімаў у мастацкіх тэкстах сучаснай беларускай літаратуры. Вырашэнне пастаўленых праблем дазволіць скласці комплекснае ўяўленне аб звароткy ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Картатэка фактычнага матэрыялу налічвае больш за 5000 канструкцый са звароткамі, выбраных шляхам суцэльнай выбаркі з празаічных, паэтычных і драматычных твораў 70 беларускіх пісьменнікаў ад класікаў да сучаснікаў (Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, К. Чорнага, У. Караткевіча, І. Мележа, А. Куляшова, Я. Брыля, А. Васілевіч, А. Дударава, І. Шамякіна, В. Быкава, М. Танка, Н. Гілевіча, А. Федарэнкі, З. Дудзюк, А. Карэліна, С. Бартохавай і інш.). Аналіз зваротка на матэрыяле твораў мастацкай літаратуры абумоўлены тым, што пісьменнікі адлюстроўваюць адметныя асаблівасці сінтаксічных канструкцый сучаснай беларускай мовы, у тым ліку дэманструюць шырокую разнастайнасць тыпаў канструкцый са звароткам.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры беларускага мовазнаўства УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" ў межах навуковай тэмы "Слова, фразеалагізм, словазлучэнне ў кантэксце", уключанай у Дзяржаўную праграму фундаментальных даследаванняў "Беларуская мова і літаратура" (2001–2005 гг.; № дзяржрэгістрацыі 2002235).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання – выявіць структурна-семантычныя і функцыянальныя асаблівасці зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных задач:

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

– удакладніць структуру, спосабы выражэння і функцыі зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове;

– распрацаваць класіфікацыю зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове;

– выявіць лексічныя адзінкі, якія з'яўляюцца найбольш пашыранымі ў творах мастацкай літаратуры ў якасці звароткаў-рэгулятываў, і раскрыць спецыфіку іх прызначэння;

– устанавіць крытэрыі выбару адрасантам пэўнай намінацыі роднасці і сваяцтва ў функцыі зваротка пры апісанні майстрамі слова сямейнай і пазасямейнай сфер зносін, выявіць асаблівасці ўжывання адрасантам назваў асоб паводле полу і ўзросту ў адносінах да адрасата;

– вызначыць нацыянальную спецыфіку выкарыстання антрапонімаў у ролі зваротка;

– паказаць залежнасць выбару зваротка адрасантам ад экстралінгвістычных фактараў.

**Навуковая навізна.** Упершыню ў беларускім мовазнаўстве на значным фактычным матэрыяле прасочваюцца тэндэнцыі функцыянавання зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Упершыню ў беларускім мовазнаўстве ўводзіцца ў навуковы зварот вялікі інвентар розных тыпаў зваротка (адзіночны, паўторны, складаны, групавы), якія зафіксаваны ў творах беларускіх пісьменнікаў. Упершыню раскрыта спецыфіка ўжывання ў беларускай мове звароткаў-рэгулятываў; устаноўлены крытэрыі выбару адрасантам пэўнай намінацыі роднасці і сваяцтва ў сямейнай і пазасямейнай сферах зносін; вызначаны асаблівасці выкарыстання адрасантам назваў асоб паводле полу і ўзросту ў адносінах да адрасата; выяўлена нацыянальная спецыфіка ўжывання антрапонімаў у ролі зваротка; паказана залежнасць выбару зваротка адрасантам ад экстралінгвістычных фактараў. Дысертацыйнае даследаванне пашырае, а ў многіх момантах удакладняе меркаванні і погляды мовазнаўцаў на сутнасць зваротка, напрыклад, на функцыі, структуру і спосабы яго выражэння ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. У арганізацыі камунікатыўнай структуры сказа выбар розных тыпаў зваротка дыферэнцыраваны сродкамі выражэння (адушаўлёныя / неадушаўлёныя назоўнікі), жанрам тэксту (проза / вершаваны / драматычны твор). Асноўнае прызначэнне неразвітага зваротка – выдзеліць адрасата з ліку тых, хто ўспрымае маўленне. Развіты зваротак выкарыстоўваецца не толькі і не столькі з мэтай устанаўлення кантакту з адрасатам, колькі для перадачы суб'ектыўных адносін да яго з боку адрасанта або з мэтай ацэначнай характарыстыкі.

2. Структурна-сэнсавая арганізацыя сказа абумоўлівае функцыянальную нагружанасць зваротка. У сучаснай беларускай мове зваротак выконвае наступныя функцыі: 1) намінатыўную, якая характарызуецца выкарыстаннем слоў розных лексіка-семантычных груп, абумоўлена граматычнай аднесенасцю,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

жанравай прыналежнасцю тэксту; 2) характарыстычна-эматыўную, якой выражаюцца суб'ектыўныя адносіны да адрасата; 3) мадальную, уласцівую звароткам-рэгулятывам; 4) устанаўлення кантакту; 5) падтрымання кантакту; 6) завяршэння кантакту з адрасатам. Першыя дзве з'яўляюцца традыцыйнымі для беларускага мовазнаўства, чатыры астатнія – новыя для беларусістыкі.

3. Рэалізуючы ў сказе мадальную функцыю, звароткі-рэгулятывы, не канкрэтызуючы субяседніка, надаюць выказванню суб'ектыўную ацэнку, сведчаць пра жаданне паспяховага кантакту са сваякамі, знаёмымі і незнаёмымі людзьмі, выражаюць зварот да прадстаўнікоў жывёльнага і расліннага свету. Найбольш шырока ў беларускай літаратурнай мове прадстаўлены звароткі-рэгулятывы, якія суадносяцца з намінацыямі кроўнай роднасці па бакавых лініях, па прамой сыходнай лініі, па прамой узыходнай лініі.

4. Аўтарамі мастацкіх твораў зваротак ужываецца пры апісанні сямейнай і пазасямейнай сфер зносін. Беларускімі пісьменнікамі намінацыі роднасці і сваяцтва ў ролі зваротка ў сямейнай сферы зносін ужываюцца з прамым значэннем, г.зн. абазначаюць сваякоў, а ў пазасямейнай сферы зносін – падвяргаюцца дэсемантызацыі і становяцца рэгулятывамі. У пазасямейнай сферы зносін выбар зваротка абумоўлены крытэрыямі полу і ўзросту субяседнікаў, а ў сямейнай сферы – роднаснымі адносінамі паміж камунікантамі і іх узроставымі характарыстыкамі.

Назвы асоб паводле полу і ўзросту пры выкарыстанні ў функцыі зваротка вызначаюцца багатай сінанімікай. У творах мастацкай літаратуры пры звароце да субяседніка ўжываюцца як стылістычна нейтральныя назвы, так і размоўныя словы.

5. Пры выкарыстанні антрапонімаў у функцыі зваротка выразна выступае нацыянальная спецыфіка сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы. На гэта ўказвае ўжыванне клічнай формы антрапоніма, зварот да людзей сталага ўзросту па формуле "дзядзька / цётка + асабовае імя". Выбар пэўнага зваротка адрасантам залежыць ад такіх экстралінгвістычных фактараў, як пол, узрост, прафесія, сацыяльны статус субяседніка, адукаванасць, месца жыхарства, ступень знаёмства камунікантаў, абставіны зносін.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем, выкананым на падставе сістэматызацыі і аналізу сабранага дысертанткай фактычнага матэрыялу, а таксама вывучэння лінгвістычных прац беларускіх і замежных даследчыкаў. Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі дысертацыі, напісаны без суаўтараў.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры беларускага мовазнаўства УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка". Асноўныя палажэнні і вынікі праведзенага даследавання прайшлі апрабацыю на 13 канферэнцыях: Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Праблемныя напрамкі развіцця мастацкай творчасці і вербальнай культуры нацыі" (Мінск, 20–21

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

лістапада 2003 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Культура речи в условиях билингвизма: состояние, перспективы, инновационные технологии” (Мінск, 25–26 лютага 2004 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Слово в культуре” (Гомель, 13–14 красавіка 2004 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 60-годдзю Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта “Актуальныя праблемы функцыянавання і развіцця лексікі славянскіх моў” (Мазыр, 7–8 кастрычніка 2004 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Актуальныя праблемы мовазнаўства (да 80-годдзя прафесара І.Я. Лепешава)” (Гродна, 28 кастрычніка 2004 г.); VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Язык и социум” (Мінск, 3–4 снежня 2004 г.); II Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Культура речи в условиях билингвизма: состояние, перспективы, инновационные технологии” (Мінск, 3–4 лістапада 2005 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Сучасны стан і дынаміка норм беларускай літаратурнай мовы” (Мінск, 24–25 кастрычніка 2006 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры”, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча (Мінск, 25–26 лістапада 2011 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Žmogus kalbos erdvėje” (Каўнас, 18–19 мая 2012 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа ў сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя” (Мінск, 25–26 верасня 2012 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Творчасць Аркадзя Куляшова ў дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць”, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры (Мінск, 29 студзеня 2014 г.); Міжнароднай інтэрдысцыплінарнай навуковай канферэнцыі “Tożsamość Słowian dawniej i dziś: język, kultura, literatura w badaniach młodych slawistów” (Варшава, 8–9 мая 2014 г.).

Матэрыялы і вынікі даследавання выкарыстаны пры выкладанні курсаў “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” і “Культура маўлення” (факультатыў) ва УА “Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь”, аб чым сведчыць акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання (Дадатак В да дысертацыі).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання адлюстраваны ў 18 публікацыях, з іх 7 – артыкулы ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях (3,1 аўт. арк.), у тым ліку ў 1 замежным, 1 артыкул у зборніку навуковых прац (0,3 аўт. арк.), 10 публікацый – у зборніках матэрыялаў міжнародных навуковых канферэнцый (2,8 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 6,2 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (260 пазіцый) і спіс публікацый саіскальніка вучонай ступені (18 пазіцый). Дысертацыя мае 3 дадаткі: А) “Зваротак, выражаны клічнай формай назоўніка”; Б) “Шматкампанентны развіты зваротак”; В) “Акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання”.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Агульны аб’ём даследавання складае 154 старонкі, у тым ліку асноўны тэкст дысертацыі – 119 старонак (з іх 1 старонку займае 1 табліца, 4 старонкі займаюць 5 малюнкаў), бібліяграфічны спіс – 22 старонкі, дадаткі – 13 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца выбар і актуальнасць тэмы даследавання, асвятляецца ступень распрацаванасці пытанняў зваротка ў працах айчынных і замежных лінгвістаў, вызначаецца метадалагічная аснова даследавання зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

У **агульнай характарыстыцы работы** адлюстроўваецца сувязь дысертацыі з навуковымі праграмамі і тэмамі, акрэсліваюцца мэта, задачы і навуковая навізна даследавання, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, падаюцца звесткі пра асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыю дысертацыі, выкарыстанне яе вынікаў, апублікаванасць вынікаў дысертацыі, яе структуру і аб’ём.

Першая глава **“Зваротак як аб’ект даследавання ў лінгвістычнай літаратуры”** складаецца з трох раздзелаў, носіць агляднa-аналітычны характар і ўтрымлівае тэарэтычныя асновы аўтарскага даследавання.

У раздзеле 1.1 ***“Лексіка-сінтаксічны падыход пры даследаванні зваротка”*** акрэсліваецца кола спрэчных пытанняў, звязаных з вывучэннем зваротка, найбольш дыскусійным з якіх з’яўляецца аргументацыя / адмаўленне сінтаксічнай сувязі зваротка са сказам.

Аналіз літаратуры па тэме даследавання пацвердзіў, што існуе некалькі асноўных падыходаў да вывучэння сінтаксічнай прыроды зваротка: адны даследчыкі лічаць, што гэтая адзінка граматычна не звязана са сказам (А.М. Пяшкоўскі, А.А. Шахматаў, І.Е. Юдкін, А.М. Гвоздзеў; А.М. Базыленка, Т.П. Бандарэнка і інш.); другія, наадварот, прытрымліваюцца погляду, што зваротак без сувязі са сказам не ўжываецца, з’яўляецца членам ці кампанентам сказа і толькі тут знаходзіць сваё выражэнне (А.Г. Руднеў, А.М. Мухін, Л.І. Шапавалава, Л.К. Дзмітрыева, В.Я. Гольдзін; Ц.П. Ломцеў, Л.І. Бурак і інш.); трэція надаюць зваротку статус самастойнага намінатыўнага сказа (В.П. Пронічаў) ці нават самастойнага выказвання (Г.В. Рыбакоў, А.П. Бейліна).

Не маюць адзінага пункту погляду вучоныя і на праблему функцыянавання зваротка, якая застаецца самай складанай пры даследаванні гэтай моўнай адзінкі, больш таго, да гэтага часу нават не выпрацаваны аднастайны тэрміналагічны апарат. Так, некаторыя лінгвісты (Л.В. Вялкіна; Л.І. Бурак, М.С. Яўневіч, Г.М. Малажай і інш.) адзначаюць наяўнасць толькі дзвюх функцый зваротка (намінатыўная ці намінатыўна-звяртальная і стылістычная ці ацэначна-экспрэсіўная), замацаваных за дадзеным кампанентам сказа, іншыя мовазнаўцы (Е.М. Галкіна-Федарук, Л.Д. Часнакова, А.С. Скоблікава; А.І. Наркевіч, В.І. Рагаўцоў, С.Я. Рапацэвіч, Л.Ф. Кахоўская і інш.) прытрымліваюцца думкі аб

адзін да аднаго на “ты” і выкарыстоўваць імя, імя па бацьку, мянушку чалавека, рэгулятывы (*Алесь, Пятровіч, Калач, браце, дружа*) [6; 7; 9; 10; 13; 16].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

1. Моўныя факты, прааналізаваныя ў дысертацыі, палажэнні і вывады даследавання будуць спрыяць далейшай распрацоўцы пытанняў тэорыі сінтаксісу, камунікатыўнага і функцыянальнага сінтаксісу, у пэўнай ступені – прагмалінгвістыкі і сацыялінгвістыкі; дазволяць больш поўна сістэматызаваць веды аб зваротку, а таксама будуць садзейнічаць павышэнню культуры маўлення, узбагачэнню слоўнікавага запасу носьбітаў мовы.

2. Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны на лекцыйных і практычных занятках у ВНУ Рэспублікі Беларусь пры выкладанні курса сінтаксісу сучаснай беларускай мовы, лінгвістычнага аналізу тэксту, культуры маўлення; пры правядзенні спецкурсаў і спецсемінараў, прысвечаных вывучэнню сінтаксісу мовы мастацкай літаратуры; пры падрыхтоўцы курсавых, дыпломных прац, магістарскіх дысертацый. Лінгвістычныя даныя дысертацыі будуць карыснымі на ўроках і факультатыўных занятках па беларускай мове ў школах, каледжах і ліцэях Рэспублікі Беларусь, пры складанні тэставых і алімпіядных заданняў па сінтаксісе беларускай мовы.

3. Атрыманыя вынікі будуць запатрабаваны пры падрыхтоўцы новай рэдакцыі граматыкі беларускай літаратурнай мовы, граматычных даведнікаў, дапаможнікаў па культуры маўлення, падручнікаў па беларускай мове. Фактычны матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны ў лексікаграфічнай практыцы, а таксама пры фарміраванні корпуса беларускай мовы.

4. Вынікі даследавання знойдуць прымяненне ў літаратуразнаўстве пры вывучэнні творчай індывідуальнасці пісьменнікаў, аўтарскай манеры падачы матэрыялу, паэтыкі.

Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях:

**Артыкулы ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях**

1. Капцюг, І. У. Лексічнае напаўненне і актуальнае значэнне зваротка / І. У. Капцюг // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2004. – № 1. – С. 66–68.

2. Капцюг, І. У. Звароткі-рэгулятывы ў беларускай мове / І. У. Капцюг // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2004. – № 2. – С. 60–62.

3. Капцюг, І. У. Намінацыі роднасці ў функцыі зваротка / І. У. Капцюг // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2004. – № 3. – С. 66–68.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

4. Капцюг, І. У. Назвы асоб па полу і ўзросту ў функцыі зваротка / І. У. Капцюг // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2005. – № 1. – С. 76–79.

5. Капцюг, І. У. Сінтаксічныя ўласцівасці зваротка: гістарыяграфічны аспект / І. У. Капцюг // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2005. – № 2. – С. 65–68.

6. Капцюг, І. У. Звароткі-антрапонімы ў беларускай мове / І. У. Капцюг // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2005. – № 3. – С. 78–81.

7. Каптюг, И. В. Обращение в современном белорусском языке / И. В. Каптюг // Žmogus kalbos erdvėje: сб. науч. ст. / Kauno humanitarinis fakultetas. – Kaunas, 2013. – Nr. 7. – P. 26–33.

**Артыкулы ў зборніках навуковых прац**

8. Капцюг, І. У. Зваротак як сродак характарыстыкі адрасата / І. У. Капцюг // Слово в культуре : сб. науч. ст. : в 2 ч. / Гомел. гос. ун-т ; под общ. ред. Л. С. Банниковой. – Гомель, 2004. – Ч. 1. – С. 38–42.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

9. Капцюг, І. У. Прагматычны падыход пры ўжыванні зваротка / І. У. Капцюг // Праблемныя напрамкі развіцця мастацкай творчасці і вербальнай культуры нацыі : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 20–21 лістап. 2003 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. І. Лугоўскі [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 77–79.

10. Капцюг, І. У. Этыкетныя формы зваротка ў беларускай мове / І. У. Капцюг // Культура речи в условиях билингвизма: состояние, перспективы, инновационные технологии : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 25–26 февр. 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: В. Д. Стариченок [и др.]. – Минск, 2004. – С. 71–74.

11. Капцюг, І. У. Тэрміны сваяцтва ў функцыі зваротка / І. У. Капцюг // Актуальныя праблемы функцыянавання і развіцця лексікі славянскіх моў : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвеч. 60-годдзю ўн-та, Мазыр, 7–8 кастр. 2004 г. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; адк. рэд. А. В. Солахаў. – Мазыр, 2004. – С. 180–182.

12. Капцюг, І. У. Тэрміны роднасці па бакавых лініях у ролі зваротка / І. У. Капцюг // Актуальныя праблемы мовазнаўства (да 80-годдзя праф. І. Я. Лепешава) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гродна, 28 кастр. 2004 г. / Гродз. дзярж. ун-т ; адк. рэд. Т. І. Тамашэвіч. – Гродна, 2004. – С. 65–69.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

13. Капцюг, І. У. Даследаванне зваротка з пазіцый сацыялінгвістыкі / І. У. Капцюг // Язык и социум : материалы VI Междунар. науч. конф., Минск, 3–4 дек. 2004 г. : в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: И. С. Ровдо [и др.]. – Минск, 2004. – Ч. 1. – С. 148–151.

14. Капцюг, І. У. Функцыі зваротка ў сказе / І. У. Капцюг // Культура речи в условиях билингвизма: состояние, перспективы, инновационные технологии : материалы II Междунар. науч. конф., Минск, 3–4 нояб. 2005 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: В. Д. Стариченок [и др.]. – Минск, 2005. – С. 57–60.

15. Капцюг, І. У. Спосабы выражэння неразвітага зваротка ў беларускай мове / І. У. Капцюг // Сучасны стан і дынаміка норм беларускай літаратурнай мовы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–25 кастр. 2006 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск, 2006. – С. 160–163.

16. Капцюг, І. У. Зваротак у творах Максіма Багдановіча / І. У. Капцюг // Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (да 120-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча), Мінск, 25–26 лістап. 2011 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: А. А. Манкевіч [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 129–132.

17. Капцюг, І. У. Асаблівасці ўжывання зваротка ў творах Якуба Коласа / І. У. Капцюг // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа ў сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа), Мінск, 25–26 верас. 2012 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: А. А. Манкевіч [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 124–129.

18. Капцюг, І. У. Лексічныя сродкі выражэння зваротка ў паэзіі Аркадзя Куляшова / І. У. Капцюг // Творчасць Аркадзя Куляшова ў дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (да 100-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова), Мінск, 29 студз. 2014 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літ. ; рэдкал.: А. А. Манкевіч [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 391–395.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## РЭЗЮМЭ

Капцюг Ірына Уладзіміраўна

### Зваротак у сучаснай беларускай літаратурнай мове: структурна-семантычны і функцыянальны аспекты

**Ключавыя словы:** зваротак, структурная арганізацыя зваротка, сродкі і спосабы выражэння зваротка, функцыі зваротка, рэгулятыў, намінацыі роднасці і сваяцтва, назвы асоб паводле полу і ўзросту, антрапонім, экстралінгвістычныя фактары.

**Мэта даследавання** – выявіць структурна-семантычныя і функцыянальныя асаблівасці зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

**Метады даследавання** – апісальны, параўнальна-супастаўляльны, элементы колькаснага падліку.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Упершыню ў беларускім мовазнаўстве на значным фактычным матэрыяле праведзена сістэмнае вывучэнне зваротка. Удакладнены функцыі, структура і спосабы выражэння зваротка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, яго сінтаксічны статус; выяўлены лексічныя адзінкі, якія шырока выкарыстоўваюцца ў якасці звароткаў-рэгулятываў, і раскрыта спецыфіка іх прызначэння; устаноўлены крытэрыі выбару адрасантам пэўнай намінацыі роднасці і сваяцтва ў сямейнай і пазасямейнай сферах зносін; вызначаны асаблівасці выкарыстання адрасантам назваў асоб паводле полу і ўзросту; выяўлена нацыянальная спецыфіка пры выкарыстанні антрапонімаў у ролі зваротка; паказана залежнасць выбару адрасантам зваротка ад экстралінгвістычных фактараў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Палажэнні і вывады дысертацыі будуць спрыяць далейшай распрацоўцы пытанняў тэорыі сінтаксісу, камунікатыўнага і функцыянальнага сінтаксісу, у пэўнай ступені – прагмалінгвістыкі і сацыялінгвістыкі. Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны на лекцыйных і практычных занятках у ВНУ Рэспублікі Беларусь пры выкладанні курса сучаснай беларускай літаратурнай мовы, лінгвістычнага аналізу тэксту, культуры маўлення; пры правядзенні спецкурсаў і спецсемінараў; пры падрыхтоўцы курсавых, дыпломных, магістарскіх прац; пры стварэнні падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для ўсіх узроўняў адукацыі. Лінгвістычныя даныя дысертацыі знойдуць прымяненне на ўроках і факультатыўных занятках па беларускай мове ў школах, каледжах і ліцэях Рэспублікі Беларусь.

**Галіна выкарыстання**: мовазнаўства, методыка выкладання беларускай мовы, літаратуразнаўства.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


**РЕЗЮМЕ**

Каптюг Ирина Владимировна

**Обращение в современном белорусском литературном языке: структурно-семантический и функциональный аспекты**

**Ключевые слова:** обращение, структурная организация обращения, средства и способы выражения обращения, функции обращения, регулятив, номинации родства и свойства, названия людей по полу и возрасту, антропоним, экстралингвистические факторы.

**Цель исследования** – выявить структурно-семантические и функциональные особенности обращения в современном белорусском литературном языке.

**Методы исследования** – описательный, сравнительно-сопоставительный, элементы количественного подсчета.

**Полученные результаты и их новизна**. Впервые в белорусском языкознании на богатом фактическом материале проведено системное изучение обращения. Уточнены функции, структура и способы выражения обращения в современном белорусском литературном языке, его синтаксический статус; выявлены лексические единицы, которые широко используются в качестве обращений-регулятивов, и раскрыта специфика их назначения; установлены критерии выбора адресантом определенной номинации родства и свойства в семейной и внесемейной сферах отношений; определены особенности использования адресантом названий людей по полу и возрасту; выявлена национальная специфика при использовании антропонимов в роли обращения; показана зависимость выбора адресантом обращения от экстралингвистических факторов.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Положения и выводы диссертации будут содействовать дальнейшей разработке вопросов теории синтаксиса, коммуникативного и функционального синтаксиса, в определенной мере – прагмалингвистики и социолингвистики. Материалы диссертации могут быть использованы на лекционных и практических занятиях в вузах Республики Беларусь в практике преподавания курса современного белорусского литературного языка, лингвистического анализа текста, культуры речи; при проведении спецкурсов и спецсеминаров; при подготовке курсовых, дипломных, магистерских работ; при создании учебников и учебных пособий для всех уровней образования. Лингвистические данные диссертации найдут применение на уроках и факультативных занятиях по белорусскому языку в школах, колледжах и лицеях Республики Беларусь.

**Область применения:** языкознание, методика преподавания белорусского языка, литературоведение.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**SUMMARY**

Kaptsiuh Iryna Uladzimirauna

**Address in the Modern Belarusian Literary Language: Structural, Semantic and Functional Aspects**

**Key words:** address, structure of address, means and ways of expression of address, functions of address, regulative, nominations of kinship, names of people by sex and age, anthroponym, extralinguistic factors.

**The purpose of the research** – to reveal structural, semantic and functional features of address in the modern Belarusian literary language.

**The methods of the research** – descriptive, contrastive-comparative, the elements of quantification.

**The results received and their novelty.** The dissertation is the first attempt in the Belarusian linguistics of system study of the address on the basis of significant amount of actual material. The functions, structure and ways of expression of the address in the modern Belarusian language are specified; the grammar status of the address is determined; lexical units which are actively used as addresses-regulatives are revealed and specifics of their use is exposed; criteria of addressant's choice of nomination of kinship both in familial and extrafamilial spheres of relationships are determined; peculiarities of addressant's use of names of people by sex and age are revealed; national features in use of anthroponyms as addresses are viewed; the dependence of the addressant's choice of the address on extralinguistic factors is proved.

**Recommendations for the practical use of the results.** Statements and conclusions of the dissertation contribute to the further investigation of the issues of sentence syntax, communicative and functional syntax and to a certain extent of pragmalinguistics and sociolinguistics. Proceedings of the dissertation can be used for lectures and practical training in the process of teaching of the modern Belarusian literary language, as well as linguistic analysis of texts and speech culture in institutions of higher education of the Republic of Belarus. It can also be used in conducting special courses and seminars, in preparation of term papers, diploma and Master's research papers. The results of the research can be implemented in writing textbooks and teaching aids for educational institutions of all levels. Linguistic data of the dissertation could be used in the Belarusian language lessons and extracurricular activities at schools, colleges and lyceums of the Republic of Belarus.

**Scope of application**: linguistics, the Belarusian language teaching methods, literary criticism.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

---

Подписано в печать 20.11.2014 Формат 60x84 1/16 Бумага офсетная
Гарнитура Roman Печать цифровая Усл.печ.л. 1,3 Уч.изд.л. 1,4
Тираж 60 экз. Заказ № 1898
ИООО «Право и экономика» 220072 Минск Сурганова 1, корп. 2
Тел. 284 18 66, 8 029 684 18 66
E-mail: pravo-v@tut.by Отпечатано на издательской системе
KONICA MINOLTA в ИООО «Право и экономика»
Свидетельство о государственной регистрации издателя,
изготовителя, распространителя печатных изданий, выданное
Министерством информации Республики Беларусь 17 февраля 2014 г.
в качестве издателя печатных изданий за № 1/185